УДК 351.74(476)(09)

***В.С. Клімчэня***

# ПЕРЫЯДЫ РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДСКІХ АДНОСІН У СФЕРЫ АХОВЫ ГРАМАДСКАГА ПАРАДКУ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ МАСАВЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Існуючыя віды масавых мерапрыемстваў, уключаючы сходы, мітынгі, шэсці, рэлігійныя святы, спартыўныя і іншыя спаборніцтвы, вядомы чалавецтву са старажытных часоў, аднак заканадаўча парадак іх правядзення быў замацаваны значна пазней, пры гэтым правілы паводзін і маральныя каштоўнасці складваліся на базе звычаяў, рытуалаў і традыцый.

На землях Беларусі адміністрацыйна-прававое рэгуляванне грамадскіх адносін у сферы аховы грамадскага парадку пры правядзенні масавых мерапрыемстваў развівалася паэтапна ад простых да больш дасканалых формаў пісьмовых крыніц права. Так, у дамовах Кіеўскай Русі з Візантыяй (911 г.), Смаленскага, Віцебскага і Полацкага княстваў з Рыгай, Готландскай зямлёй і нямецкімі гарадамі (1229 г.) утрымліваліся нормы адміністрацыйна-прававога і крымінальна-прававога характару, накіраваныя на забеспячэнне грамадскага парадку і бяспекі, якія ўстанаўлівалі адказнасць за забойства чалавека, крадзеж маёмасці, прычыненне цялесных пашкоджанняў і прымяняліся да парушальнікаў, у тым ліку пры правядзенні рэлігійных святаў, кірмашоў і народных гулянняў. Ахова населеных пунктаў, жыцця і асабістай маёмасці з'яўлялася задачай самога насельніцтва, і толькі ў асаблівых абставінах дзяржавы-княствы прымалі на сябе функцыю па абароне насельніцтва і аднаўленню парушанага парадку сіламі княжацкіх дружын.

З сярэдзіны XIII ст. княствы, якія існавалі на тэрыторыях Беларусі і Літвы, увайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. У другой палове XIII – XVIII ст. у ВКЛ дынамічна развівалася агульназемскае права, што патрабавала сістэматызацыі і кадыфікацыі нормаў права з мэтай упарадкавання грамадскіх адносін. Першая спроба кадыфікацыі нормаў права была прадпрынятая шляхам выдання Судзебніка Казіміра (1468 г.), 25 артыкулаў якога ўтрымлівалі нормы крымінальнага, грамадзянскага і адміністрацыйнага права. У XVI ст. распрацоўваюцца зборы законаў – Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг., якімі ўстанаўліваліся пэўныя забароны і правілы па абмяжаванню абароту халоднай зброі, гандлю алкагольнымі вырабамі, знаходжання ў населеных пунктах асоб, якія вялі асацыяльны лад жыцця, непрацуючых і схільных да парушэнняў, што значна спрыяла фармаванню ў насельніцтва законапаслухмяных паводзін.

За грамадскім парадкам і спакоем у межах ВКЛ наглядаў вялікі князь Літоўскі, у ваяводствах гэтыя функцыі выконвалі ваяводы, у межах старостваў – старосты, у гарадах – гарадскія войты, на тэрыторыі паветаў – гарадскія і земскія суды. Ахову грамадскага парадку ажыццяўлялі дружыны, ваенна-служылыя групы, стралецкія падраздзяленні, ваенныя апалчэнні (міліцыя).

Па выніках Люблінскай уніі землі ВКЛ і Каралеўства Польскага з 1569 г. па 1795 г. аб'ядналіся ў адзіную дзяржаву – Рэч Паспалітую. У 70-х гг. XVIII ст. у гарадах каралеўскай юрысдыкцыі (Магілёў, Полацк, Віцебск і інш.) былі ўтвораны органы мясцовай адміністрацыі – камісіі boni ordinis (добрага парадку), якія выконвалі некаторыя паліцэйскія функцыі – нагляд за справамі спакою і публічнай бяспекі. Згодна з Канстытуцыяй Рэчы Паспалітай абодвух народаў (1791 г.) вышэйшым органам выканаўчай улады з'яўлялася Варта законаў (цэнтральны ўрад) у склад якой уваходзіў міністр паліцыі. Функцыі па падтрыманню грамадскага парадку ўскладаліся на Камісію паліцыі абодвух народаў, якая для навядзення парадку мела дзве харугвы, а ў выпадку вострай неабходнасці магла прыцягваць іншыя рэгулярныя вайсковыя фармаванні.

У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795 гг.) беларускія землі былі далучаны да Расійскай імперыі, паступова адбывалася замена заканадаўства ВКЛ і Рэчы Паспалітай імперскім, аднак Статут ВКЛ 1588 г. заставаўся асноўнай крыніцай права да 1840 г.

У першай палове XIX ст. грамадска-палітычнае становішча ў Расійскай імперыі было асабліва складаным у сувязі з вядзеннем ваенных дзеянняў і ўзмацненнем нацыянальна-вызваленчых рухаў на далучаных землях. З мэтай захавання грамадскага парадку і спакою ў заканадаўства Расійскай імперыі ўносяцца істотныя змяненні, накіраваныя на наданне шырокіх карных паўнамоцтваў органам паліцыі. Так, у Статуце папярэджання і спынення злачынстваў (у рэдакцыі 1842, 1857, 1876 гг.) дадзены пералік злачынстваў супраць рэлігіі, грамадскага парадку, асабістай бяспекі і маёмасці, змешчаны прадпісанні і забароны, якія тычыліся паводзін у перыяд правядзення рэлігійных абрадаў і свят, народных гулянняў і тэатральных паказаў.

14 жніўня 1881 г. у сувязі з узмацненнем рэвалюцыйнага руху царскім урадам было прынята Палажэнне аб мерах па ахове дзяржаўнага парадку і грамадскага спакою, якое прадугледжвала ўвядзенне дзвюх стадый выключнага становішча – стану ўзмоцненай аховы і стану надзвычайнай аховы. Названыя стадыі выключнага становішча ў пачатку XX ст. пашыраліся больш чым на $^1/_3$ насельніцтва Расійскай імперыі, і іх дзеянне, нягледзячы на часовы характар, неаднаразова працягвалася аж да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

Сацыяльныя ўзрушэнні ў Расіі на пачатку XX ст. сфарміравалі аснову да пераходу ад абсалютнай да канстытуцыйнай манархіі, што спрыяла ўтварэнню розных палітычных арганізацый, абвяшчэнню асноўных правоў і свабод чалавека – недатыкальнасці асобы, свабоды сумлення, слова, сходаў і саюзаў.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі Часовы ўрад 25 (12) красавіка 1917 г. прыняў пастанову «Аб сходах і саюзах», у якой замацоўвалася права ўсіх без выключэння расійскіх грамадзян «без спецыяльнага дазволу ладзіць сходы як у закрытых памяшканнях, так і пад адкрытым небам».

Аднак насельніцтва Беларусі не магло карыстацца абвешчаным правам па прычыне складанага ваенна-палітычнага становішча ў сувязі з працягам Першай сусветнай вайны і вядзеннем баявых дзеянняў на яе тэрыторыі.

Далейшае развіццё права грамадзян на свабоду слова і сходаў атрымала з прыняццем Канстытуцый БССР 1927 і 1937 гг., аднак яно гарантавалася толькі прадстаўнікам працоўнага народу і выключна ў мэтах умацавання сацыялістычнага

ладу. У выніку ратыфікацыі 18 верасня 1973 г. урадам СССР прынятага ў рамках ААН Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах чалавека (1966 г.) стандарты ў галіне грамадзянскіх, палітычных, эканамічных, сацыяльных і культурных правоў чалавека і грамадзяніна, а таксама гарантыі іх забеспячэння знайшлі замацаванне ў Канстытуцыі БССР 1978 г. Неабходна адзначыць, што за гэты час закона аб рэалізацыі дэклараваных правоў і свабод выдадзена не было.

У 1983–1991 гг. у краіне на фоне палітычнага і сацыяльна-эканамічнага крызісу адзначалася павялічэнне правапарушэнняў на вуліцах, стадыёнах, у парках, клубах і іншых грамадскіх месцах, а таксама колькасці несанкцыяніраваных сходаў, мітынгаў і дэманстрацый. Для забеспячэння грамадскага парадку ў гарадах павялічвалася колькасць супрацоўнікаў патрульна-паставой службы міліцыі, у сталіцах ствараліся атрады міліцыі асобага прызначэння, у выключных выпадках задзейнічаліся армейскія падраздзяленні.

У мэтах рэалізацыі правоў і свабод грамадзян, забеспячэння грамадскага парадку пры правядзенні масавых мерапрыемстваў Савет Міністраў СССР 28 сакавіка 1983 г. прыняў пастанову «Аб парадку правядзення масавых спартыўных мерапрыемстваў у краіне», Законам БССР ад 8 красавіка 1988 г. было зацверджана Палажэнне аб парадку арганізацыі і правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый і Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР 28 ліпеня 1988 г. выдаў Указ «Аб парадку арганізацыі і правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый у СССР», якія замацоўвалі адпаведны механізм рэалізацыі і адпавядалі міжнародным стандартам у галіне правоў чалавека і грамадзяніна.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ўзнікненню і станаўленню адміністрацыйна-прававога рэгулявання грамадскіх адносін у сферы аховы грамадскага парадку пры правядзенні масавых мерапрыемстваў спрыялі аб’ектыўныя гістарычныя перадумовы, якія патрабавалі пэўнага дзяржаўнага ўмяшання з мэтай упарадкавання міжсацыяльных адносін, стварэння ўмоў для функцыянавання дзяржавы і дзяржаўных інстытутаў, недапушчэння парушэнняў грамадскага парадку, фармавання законапаслухмяных паводзін грамадзян.

Непасрэдна перыяды ўзнікнення, станаўлення і развіцця адміністрацыйна-прававога рэгулявання грамадскіх адносін у сферы аховы грамадскага парадку пры правядзенні масавых мерапрыемстваў на тэрыторыі Беларусі неабходна разглядаць ва ўзаемасувязі з гістарычнымі перыядамі развіцця беларускай дзяржаўнасці: старажытнабеларускім перыядам (IX – першая палова XIII ст.), беларуска-літоўскім перыядам і перыядам уваходжання беларускіх земляў у склад Рэчы Паспалітай (другая палова XIII – XVIII ст.), перыядам знаходжання беларускіх тэрыторый у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII ст. – 1917 г.) і савецкім перыядам (кастрычнік 1917 г. – жнівень 1991 г.).

УДК 314.1 + 351.74

***А.А. Козел***

## ПРИНЦИПЫ ПРАВА КАК ПРИНЦИПЫ ПРАВООХРАНИТЕЛЬНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОРГАНОВ ВНУТРЕННИХ ДЕЛ

Общество как исторически сложившаяся форма жизнедеятельности людей, взаимодействующих друг с другом, создало цельную совокупность инструментов и способов, обеспечивающих его устойчивость и развитие. В этой совокупности, на наш взгляд, главную роль выполняет государство и социальные институты, реализующие индивидуальные и общественные потребности. Для устойчивого развития белорусского общества особое значение имеет нормальное функционирование таких его институтов, как экономика, право, армия, семья, образование, религия. Каждый из указанных социальных институтов выполняет свои специфические функции. Задачей экономики является обеспечение материального благополучия граждан, семьи – воспроизведение населения, воспитание нового поколения на традиционных для белорусского народа ценностях, армии – защита государства от внешних угроз, образования – сохранение и приумножение интеллекта нации, религиозных организаций – ориентация верующих на межконфессиональное согласие и веротерпимость, забота о духовном здоровье народа. В силу своей особенности право выполняет объединительную роль интегратора всех социальных институтов. Обычно исследователи указывают главным образом на общеобязательность и принудительный характер права как детерминанты его социальной специфики. Мы же обращаем внимание и на другие, на наш взгляд, более глубинные особенности права, заключающиеся в его принципах.

В философской литературе понятие «принцип» определяется как начало, основа, происхождение, первопричина и основание некоторой совокупности фактов и знаний, исходный пункт объяснения или руководства к действиям. В теории права принципы права вербализуются как основополагающие начала, отправные положения, организационные основания возникновения, развития и функционирования права, определяющие общую направленность правового регулирования общественных отношений. В современном отечественном и российском правоведении такой подход к пониманию принципов права является общепризнанным. Выделяют общеправовые, межотраслевые, отраслевые и принципы правовых институтов. Общеправовые принципы – принципы справедливости, законности, свободы, гуманизма, демократизма, юридического равенства. Некоторые исследователи (В.К. Бабаев, М.И. Байтин, В.Н. Карташов, В.В. Оксамытный и др.), подчеркивая их значимость, называют эти принципы права генеральными. Предметом нашего исследования как раз и является анализ воздействия перечисленных принципов права на правоохранительную деятельность органов внутренних дел Республики Беларусь, поскольку из теории принципов прямо следует вывод, что они являются и принципами правоохранительной деятельности.

Ключевым принципом для служебной деятельности органов внутренних дел является принцип справедливости. Причем справедливость мы рассматриваем не как этическую или социально-политическую, а как правовую категорию. История права свидетельствует об изначально правовом статусе категории «справедливость»: у древних греков справедливость персони-